**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Мінск, Калектарная, 10.
Тэл. 220-86-87, факс 220-96-84

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Минск, Коллекторная, 10.
Тел. 220-86-87, факс 220-96-84

28.08.2001 06-04/ 9979

Рада Грамадскага аб'яднання
"Праваабарончы цэнтр"Вясна"

вул. М.Багдановіча,7а,
220029, г. Мінск

Пісьмовае папярэджанне

У адпаведнасці з артыкулам 25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" Міністэрства юстыцыі запатрабавала ад Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр"Вясна" пратаколы пасяджанняў выбарных органаў пачынаючы з кастрычніка 2000г. і звесткі аб наяўнасці арганізацыйных адзінак і пастаноўцы іх на ўлік ці рэгістрацыі.

Пратаколы ці акты рэвізійнай камісіі і звесткі аб арганізацыйных адзінках наогул не прадстаўлены, а пратаколы Рады не ў поўнай колькасці і без дадаткаў, якія азначаны ў іх тэксце, а асобныя з іх пад адным нумарам і маюць іншую дату і змест.

Данесена сем пратаколаў без дадаткаў (№ 92,134-138, 145 і 230). Зыходзячы з нумерацыі адсутнічае сто трыдцать адзін пратакол.

Больш таго, Міністэрства юстыцыі мае інфармацыю аб тым, што афармленне пратаколаў, па вызначэнню назіральнікаў, не адпавядае патрабаванням справаводству (пратакол не падпісаны, не вызначаны прозвішчы тых, адносна каго прымаліся рашэнні і г.д.) і яны дасылаюцца на месцы, дзе і выкарыстоўваюцца.

Акрамя таго, ад аб'яднання ў Міністэрства юстыцыі паступілі лісты ад імя шэрагу грамадскіх аб'днанняў (значная частка прадстаўнікоў гэтых аб'яднанняў адмовілася ад удзелу ў падрыхтоўцы лістоў), якія не падпісаны кіраўнікамі гэтых аб'яднанняў ці асобамі імі упаўнаважанымі чым парушаны патрабаванні Прыкладной інструкцыі па справаводству ў міністэрствах, дзяржаўных камітэтах і іншых цэнтральных органах кіравання, установах, арганізацыях і на прадпрыемствах Рэспублікі Беларусь, зацверджанай загадам Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь ад 25.05.1999 за № 13.

Пры такіх абставінах Радзе Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" вынесена пісьмовае папярэджанне.

Аб прынятых мерах неабходна паведаміць Міністэрства ў двухтыдневы тэрмін з прадстаўленнем пратакола Рады.

Адначасова растлумачваем, што пры наяўнасці паўторных на працягу года парушэнняў за якія ўжо выносілася пісьмовае папярэджанне, можа быць узнята пытанне аб ліквідвцыі аб'яднання.

Начальнік Упраўлення
грамадскіх аб'яднанняў М.М. Сухінін

220 89 00